Вячаслаў Швед

# Дэпартаваныя са шляхецкіх ваколіцаў ў «аддаляныя губерні Расіі» падчас Студзенскага паўстання 1863–1864 гг.

Przegląd Środkowo-Wschodni 1, 101-121

2016

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Вячаслаў Швед
Uniwersytet Warszawski
cronon56@gmail.com

# Дэпартаваныя са шляхецкіх ваколіцаў ў «аддаляныя губерні Расіі» падчас Студзенскага паўстання 1863–1864 гг.

Keywords: Uprising 1863–1864, deportation, confiscation, relocation, remote regions of Russia
Słowa kluczowe: powstanie 1863–1864, deportacja, konfiskata, przesiedlenie, „odległe gubernie Rosji"

**Deportacje szlachty województwa grodzieńskiego w czasie powstania styczniowego 1863–1864**
W artykule zreferowano temat represji, które dotknęły szlachtę województwa grodzieńskiego za udział w powstaniu 1863–1864 r. Obejmowały one głównie deportacje oraz palenie majątków szlacheckich. Szczuki w powiecie grodzieńskim zostały spalone 24–25.07.1863 r. (daty podane są wg starego stylu), deportowano 15 rodzin; Jaworówka w powiecie białostockim – spalone 18.08.1863, deportowano 14 rodzin; Penyashki, powiat Pruzhanski – 08.09.1863, 40 osób; Lukowica, powiat bielski – 20.09.1863, 42 rodziny; Prushanka-Baranka, powiat bielski – 24.05.1864, 11 rodzin. W ten sposób wykonano „plan Murawjowa". Palenie majątków i deportacja mieszkańców w bliskiej perspektywie miała za zadanie zastraszenie szlachty i odsunięcie jej od ruchu powstańczego, by w ten sposób ugasić powstanie. W dalszej perspektywie konfiskata gruntów i nieruchomości miała podważyć stabilność gospodarczą szlachty, żeby nie mogla ona finansować kolejnych buntów. Majątki szlacheckie planowano zasiedlić rosyjskimi ziemianami w celu wzmocnienia „elementu rosyjskiego" w „Kraju Zachodnim".

**The deportation of the nobility of Grodno province in the time uprising of 1863–1864**
The author talks about the deportation of the population and the burning of the gentry outskirts of Grodno province for participating in the uprising of 1863–1864.

(Old Style date): Szczuky Grodno district (burned 24–25.07.1863 g, 15 families); Yavorovka Belastokski district (18.08.1863, 14 families); Penyashki Pruzhany district (08.09.1863, 40 persons.); Bulb county Belsky (20.09.1863, at 42 families); Prushanka-Baranka Belsky district (24.05.1864, at 11 families). Thus performed "Muravyova system". Burning nobiliary outskirts of deportation and residents were to decide the next and perspektiv tasks. Initially intimidated gentry and detach it from the rebel movement and thereby extinguish the uprising. And the future of the gentry save land, property – undermining economic position that it does not fund future muggle revolt. In the gentry land it was planned to have a Russian landowners in order to strengthen the "Russian element" in the "Western Region".

У раней публікаваных артыкулах аб паўстанні 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі мала ўдзелялася ўвазе палітыцы дэпартацыі мясцовых жыхароў за ўдзел у паўстанні. У прапанаваным матэрыяле мы апісваем як ажыццяўлялася яна ў дачыненні шляхецкіх ваколіц Гродзенскай губерні, называем прозвішчы людзей і ўзгадваем іх лёс.

Жыхары ваколіцы Шчукі Гродзенскага ўезда (знаходзілася ў Камянецкай воласці, недалёка ад Скідзеля) за дапамогу паўстанцам былі выселены з месца жыхарства, ваколіца спалена 24–25.07.1863 г., а зямля аддадзена ў казну згодна прапанове гродзенскага губернатара ад 14 (29). 09.1863 г. Арыштаваных жыхароў Шчук трымалі пад вартай у Рубалаўскай карчме, а потым саслалі ў расійскія губерні[1]. Ніжэй прыводзіцца спіс дэпартаваных з выяўленымі на дадзены момант біяграфічнымі дадзенымі:

1. Шчука Іван ці Ян, высланы ў Томскую губ. разам з сям'ёй. У 1875 г. атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму. Пераехаў спачатку ў Варшаву, праз паўтара года – у маёнтак Дамакаўшчызна

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: НГАБ) у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 257; А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне ў 1863–1864 гг.*, „Arche" 12/2010, s. 156.

Гродзенскага ўезда, і працаваў у Пуслоўскага. У 1891 г. жыў з 4 сынамі ў маёнтку Зарубічы Гродзенскага ў.[2]

2. Шчука Сцяпан (Сямён), шляхціц, высланы ў Кастрамскую губ. разам з жонкай, 2 сынамі і 2 дачкамі. У 1874 г. атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму. У наступным годзе жыў у Сувалкаўскай губ. [3]
3. Шчука Тадэвуш (Фадзей) Карлавіч, шляхціц, высланы ў Тамбоўскую губ. з жонкай, сынам і дачкой. Служыў на Грaзе--Царыцынскай чыгунцы бар'ерным ахоўнікам. Задаўлены 1.10.1870 г. пасажырскім цягніком каля Токараўскай станцыі Тамбоўскага ўезда[4].
4. Шчука Мікалай высланы з жонкай, сынам, ягонай жонкай і дачкой высланы ў Арэнбургскую губ.
5. Шчука Восіп высланы з жонкай, 3 сынамі і 2 дачкамі ў Пермскую губ.
6. Шчука Вікенці высланы з сынам і дочкай ў Аланецкую губ. Жонка, бацька, брат і сястра, верагодна, збеглі.
7. Шчука Восіп Міхайлавіч высланы с жонкай, 2 сынамі і дочкай ў Наўгародскую губ. У 1874 г. дазволена вярнуцца, але ў 1876 г. яшчэ знаходзіўся на месцы пасялення.
8. Шчука Станіслаў высланы с жонкай і 2 сынамі ў Валагодскую губ. Верагодна, пра гэтую сям'ю ўспамінаў Паўловіч, калі пісаў пра высылку бацькоў з двума сынамі 13 і 16 гадоў у вёску ў 40 км ад Тацьмы Валагодскай губ[5].
9. Шчука Ігнат Францэвіч высланы с жонкай, 2 сынамі і дочкай ў Самарскую губ. Памёр у чэрвені 1864 г.

[2] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 668; А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў..., op.cit.*, s. 173.

[3] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 510; А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў..., op.cit.*, s. 170.

[4] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 659.

[5] E. Pawłowicz, *Wspomnienia. Nowogródek, więzienie – wygnanie*, Lwów 1887, s. 270.

10. Шчука Вінцэнт высланы с жонкай, 3 сынамі і дочкай ў Саратаўскую губ. Памёр 16.07.1879 г. у слабадзе Альхова Царыцынскага ўезда Саратаўскай губ.
11. Шчука Мартын Восіпавіч высланы з жонкай і сынам (2 другіх былі "у адлучцы") у Пензенскую губ. Памёр у 1871 г.
12. Шчука Станіслаў высланы с жонкай, 2 сынамі і 2 дачкамі ў Кастрамскую губ.
13. Шчука Разалія, удава выслана з 2 сынамі і 4 дачкамі ў Самарскую губ., не гледзячы на тое, што зввар'яцела. Памерла падчас перасылкі ў г. Сургане Ніжэгародскай губ.
14. Амбрусевіч (Амбрушэвіч) Ігнат высланы з жонкай Мартыянай у Арэнбургскую губ. У 1880 г. яму было 70 год, жыў у Арэнбургу і займаўся рамяслом. У ліпені яму дазволілі вярнуцца дамоў і ён пасяліўся з жонкай у маёнтку Будоўля гродзенскай губ.
15. Амбрусевіч Антон высланы з жонкай, сынам і дачкой, жонкай і дзецьмі старэйшага сына Сцяпана (сын і 2 дачкі) у Пермскую губ[6].

Ваколіца Яవараўка Беластоцкага ўезда была спалена 18 жніўня 1863 г. за актыўнае садзейнічанне жыхароў паўстанцам. Яны арганізавалі сховішча на лодках, якія хаваліся на востравах рэк Супрасль і Нарва, перавозілі інсургентаў з Каралеўства Польскага ў Гродзенскую губ. і назад. Сяло мела 27 шляхецкіх двароў, 61 мужчынскую і 80 жаночых душ. Узяты пад арышт і ўтрымліваліся ў намётах у ваколіцах Беластока. Жывёла і рухомая маёмасць была вывезена ў Беласток для продажу на аўкцыёне[7]. Экзэкуцыю ажыццяўлялі 3 узвода Новаінгерманландскага палка

[6] А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў..., op.cit.*, s. 157, 169–172 (для № 4–15).

[7] *Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864,* Москва 1965, с. 378–379; P. Powierza, *Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora*, Białystok 1996, s. 103.

і 2 сотні казакаў. Яўараўцы былі выселены ў Заходнюю Сібір, дзе на р. Енісей збудавалі Яўараўку. Пазней іх перасялілі ў Краснаярск, а вёску залілі вадой.

На месца выселяных мясцовых жыхароў прывезлі рускіх пасяленцаў, у 1868 і 1869 гг. ім выдзелілі грошы ў суме 1013 руб. 14 ½ кап. для закупкі хлеба (верагодна, зярна для пасева). Была прадстаўлена да 1869 г. льгота ў падатках, а 15.04.1870 г. з'явіўся указ Сената аб новых ільготах для рускіх перасяленцаў у паўночна-заходніх губернях[8].

У спісе высланых было 198 чалавек:

1. Антановічы – 4 чал.
2. Багінскія – 11 чал.
3. Брасоўскіе – 2 чал.
4. Хвейабвейнаўскія – 2 чал.
5. Яворскія – 117 чал.
6. Еруйскія – 3 чал.
7. Кулешы – 5 чал.
8. Лянчэўскія – 5 чал.
9. Плонскія – 6 чал.
10. Семяняка – 1 чал.
11. Сінільскія – 8 чал.
12. Внароўскія – 3 чал.
13. Войны – 8 чал.
14. Врачынскі – 1 чал[9].

Некаторыя падрабязнасці даюць матэрыялы Гістарычнага архіва Омскай вобласці[10]. У спісе, прадстаўленым С. Мулінай знаходзім наступныя прозвішчы:

[8] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 533; А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў…*, *op.cit*., s. 157.

[9] *1863. Katalog miejsc pamięci powstania styczniowego w województwie podlaskim*, Białystok 2013, s. 35.

[10] С. Муліна, *Удзельнікі паўстання 1863 года з Заходняга краю ў заходнесібірскай ссылцы*, „Arche" 12/2010, s. 265–266.

1. Плонскі Павел, 56 гадоў, жонка Людвіка, 50 гадоў, 2 сыны і 1 дачка паселяны ў Каінскай акрузе.
2. Яварoўскі Матэвуш, 44 гадоў, жонка Юстына, 27 гадоў, сын і дачка паселяны ў Томскай акрузе.
3. Яварoўскі Станіслаў, 48 гадоў, жонка Мар'яна, 48 гадоў, 3 сына і 1 дачка паселяны ў Марыінскай акрузе.
4. Яварoўская Кацярына, удава 50 гадоў, сын і 2 дачкі паселяны ў Каінскай акрузе.
5. Кулеш Ян, жонка Разалія, 40 гадоў, сын і 2 дачкі паселены ў Томскай акрузе.
6. Багінскі Ян, 62 гадоў. жонка Францішка, сын і 3 дачкі паселяны ў Марыінскай акрузе.
7. Яварoўскі Юзэф, 55 гадоў, сын Пётр, 25 гадоў паселены ў Каінскай акрузе.
8. Яварoўскі Антоні, 55 гадоў, жонка Ганна, 40 гадоў, 3 дачкі паселяны ў Омскай акрузе.
9. Яварoўская Францішка, удава 50 гадоў, сын і дачка паселяны ў Ялатураўскай акрузе.
10. Яварoўскі Андрэй, 60 гадоў, жонка Мар'яна, 50 гадоў, 2 сыноў і 2 дачкі паселяны Томскай акрузе.
11. Яварoўскі Матэвуш, 43 гады, жонка Мар'яна, 33 гады, 2 сыны паселяны ў Тарскай акрузе.
12. Яварoўскі Франц, 52 гады, жонка Альжбета, 40 гадоў, сын і дачка паселяны ў Марыінскай акрузе.
13. Яварoўская Тэафіля, 50 гадоў. 2 сыноў паселены ў Марыінскай акрузе.
14. Яварoўскі Станіслаў, жонка Разалія, 60 гадоў, дачка Магдалена, зяць Пётр Аншанаў, унук і 2 унучкі.

Згодна з рапартам вайсковага начальніка г. Пружан з уездам маёра фон Крэмера, 8 (20) верасня 1863 г. ён акружыў ваколіцу Пеняшкі цепам пяхоты з казакамі яшчэ да світанку і прастаяў

так да 9 гадзіны. Калі прыйшлі сагнаныя з вакольных вёсак шляхта, памешчыкі і селяне, тады вывялі гаспадароў ваколіцы і прачыталі ім прадпісанне вайсковага губернатара горада Гродна і Гродзеенскага цывільнага губернатара за № 3416. У ім гаварылася, што жыхары Пеняшкаў спачувалі паўстанцам, давалі ім харчаванне, неабходныя рэчы, не данеслі ўладам на паўстанцкі атрад, які 2 тыдні базаваўся каля Глыбокага Кута. За гэтае яны падлягаюць арышту, а іх маёмасць і жывёла канфіскацыі, зямля будзе роздана суседнім сялянам, а сама ваколіца будзе спаляна[11].

Так і было зроблена. Ваколіцу падпалілі з усіх бакоў адначасова, маёмасць прадалі з аўкцыёнаў на месцы і ў Пружанах, зямлю аддалі сялянскаму Сухапольскаму таварыству, жыхароў трымалі пад арыштам у Пружанах. У імянным спісе жыхароў ваколіцы Пеняшкі налічвалася 40 чалавек[12]:

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Узрост | Месца высылкі |
|---|---|---|---|
| 1 | Мілюшчук (Мелешчук) Юльян Матвееў | 45 | У Астраханскую губерню |
| 2 | У яго сямействе: | 40 | |
| 3 | Канстанцін Матвеев | 30 | |
| 4 | Жонка яго Юзэфа | 65 | |
| 5 | Маці Юльяна Анеля | 22 | |
| | Шпачанка Дамініка Кандрацьева, служка з сялян в. Явалава Сухапольскай воласці. | | |
| 6 | Сын яе Касьян | 6 | |
| 7 | Кавалевіч Якім Іванаў, батрак, селянін в. Слопілшчаў Ліпоўскай воласці | 20 | |
| 1 | Бурачэўскі Андрэй Раманаў | 60 | У Самарскую губерню |
| 2 | Жонка яго Францішка Францава | 40 | |
| 3 | Дачка Анэля | 3тыдня | |
| 4 | Брат Андрэя Марцін | 64 | |

[11] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 3–3 адв., 10–11.

[12] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 6–6 адв.

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Узрост | Месца высылкі |
|---|---|---|---|
| 1 | Цэбрусінскі Франц Францавіч, дваранін | 27 | У Самарскую |
| 2 | Жонка яго Францішка | 25 | губерню |
| 3 | Сын Баляслаў | 5 | |
| 4 | Дачка Мальвіна | 2 | |
| 5 | Брат яго Іосіф Францев | 25 | |
| 6 | Малюска Антон, батрак, селянін в. | 18 | |
| 7 | Гараднян Літоўскай воласці | 13 | |
| 8 | Міхаіл, пастух селянін таго ж грамадства | 20 | |
| | Маврося, дзеўка з Літоўскай воласці | | |
| 1 | Сапер Мотель, яўрэй | 49 | У Томскую |
| 2 | Жонка яго Эстерка Моўшаўна | 42 | губерню |
| 3 | Сын Абрам | 17 | |
| 4 | Сын Шмуйло, жыве ў Пружан. с жонкаю | 20 | |
| 5 | Дачка Перна | 8 | |
| 6 | Маці Таўба | 62 | |
| 1 | Лерман Рахмель Беркавіч | 35 | У Томскую |
| 2 | Жонка яго Сара | 35 | губерню |
| 3 | Сын Янкель | 11 | |
| 4 | Сын Ренок | 6 | |
| 5 | Дачка Хана | 13 | |
| 6 | Дачка Фейга | 3тыдня | |
| 1 | Найман Гершка Беркавіч | 42 | У Табольскую |
| 2 | Жонка яго Златка | 40 | губерню |
| 3 | Сын Засел | 5 | |
| 4 | Сын Гдал | 8 | |
| 5 | Дачка Гершка Рыўка | 23 | |
| 6 | Дачка Ромна | 20 | |
| 7 | Дачка Раана | 10 | |
| 8 | Дачка Лея | 8 | |
| 9 | Цацыпка Фоль Аранавіч, зяць Гершка, муж Рыўкі | 17 | |

Названыя вышэй асобы трох першых па спісу сямейств былі адасланы ў Гродна. Яўрэйскія сем'і пакінулі на месцы для выяснення абставін. З прашэння свіслацкага яўрэя Шамеля Левіна стала вядома, што яўрэі ваколіцы Пеняшкі пасылалі сваіх да расійскіх васкоўцаў з папярэджваннем пра паўстанцаў. З дакументаў больш позняга паходжання вядома, што сям'ю Мелешчука саслалі не ў Астраханскую губ., а ў Томскую. Яўрэі Нейман і Лерман пасланы ва Ўладзімірскія арыштанцкія роты Грамадзянскага ведамства на 2 гады, з наступным пасяленнем на казённыя землі ў Сібіры. Сем'і Бурачэўскага і Цэбрусінскага пасяліліся ў Пермскай губ. У 1868 г. апошні жыў ужо ў Царстве Польскім і прасіў дазволу прыехаць у Пружанскі ўезд для продажу сваёй зямлі (якая, як высвялтілася, яму ўжо не належала)[13].

У верасні 1863 г. збіраліся высіліць жыхароў ваколіцы Фалькі. Прывядзем вытрымку з рапарта вайсковага начальніка Бельска і ўезда Барэйшы: "Находзячы зусім неабходным зрабіць прыклад высялення шляхты ваколіцы Фалькі, дзе безупынна фарміруюцца і хаваюцца больш ці менш значныя шайкі, пытаюся дазволу Вашага Правасхадзіцельства (вайсковага губернатара г. Гродна і Гродзенскага цывільнага губернатара – В.Ш.) аб перасяленні ўсёй шляхты гэтых ваколіц у аддаляныя губерні, аб канфіскацыі прыналежачых гэтай шляхце зямель і перадачы часткі іх сямействам адстаўных салдат і сялянам, пацярпеўшым за адданасць ураду". У Фальках-Старых у той час было 1 цягла, 2 душы; у Фальках-Гадзебы – 2 цягла, 8 душ; у Фальках-Філіпках – 2 цягла, 6 душ[14].

Адзін з жыхароў ваколіцы Лукавіца Бельскага ўезда, паўстанец, быў пасланы камандзірам атрада Б. Эйтміновічам да рускіх, як бы з даносам пра месцазнаходжання атрада. Паўстанцы зрабілі засаду і 19.09.1863 г. знішчылі да 150

[13] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 15, 16, 47, 52, 62–62 адв., 69, 72.

[14] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 1а., 2а.

расійцаў. Вайсковы начальнік Бельскага ўезда Барэйша ў рапарце ад 11.09.1863 г. вайсковаму губернатару г. Гродна і Гродзенскаму цывільнаму губернатару пісаў: “Неабходным лічу прасіць Вашего Правасхадзіцельства дазволу на спаленне ваколіцы Лукавіц, бо яна складае галоўную крыніцу густой крамолы ў давераным мне ўездзе, адкуль разліваецца па цэламу Бельскаму ўезду”[15].

Дазвол быў атрыманы і Барэйша загадаў спаліць вёску. 30 казакаў з атрадаў палкоўніка Бярэйшы і маёра Банецкага акружылі ваколіцу Лукавіца 20 верасня (2 кастрычніка) 1863 г., пяхота падыйшла ў 3 гадзіны папалудня. Жыхары былі арыштаваны, пачалася канфіскацыя маёмасці. 23 верасня (5 кастрычніка) у 7 гадзін пасля палудня ваколіца была спалена ў прысутнасці вакольных памешчыкаў, шляхты, сялянства. Ад полымя было светла нават у Бельску, а спужаныя сяляне в. Малешы сабраліся вакол свайго прыходскага святара, які патлумачыў ім ганебнасць паступкаў жыхароў Лукавіцы[16]. Каля тыдня жыхары былі пад арыштам у Бельску, куды звозілі і маёмасць жыхароў, а потым у Гродне. Адсюль па чыгунцы іх дастаўлялі ў Санкт-Пецярбург (усяго 130 чал.), Вільна (усяго 21 чал.)[17].

З Беластока палкоўнік Мантэнфельд дакладваў 9.10.1863 гродзенскаму губернатару генералу Скварцову: “Палкоўнік Барэйша паведаміў мяне для данясення вам, што бельскі ўездны прадвадзіцель прыедзе ў Гродна 28-га верасня (па новаму стылю 10 кастрычніка. – В.Ш.). Ваколіца Лукавіцы спалена. Вясковыя каравулы выстаўлены ў Пяткове, Войтках і Нареве”[18]. Маёмасць высланых жыхароў прадавалася з аўкцыёна[19]. У НГАБ у Гродне

[15] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 2.

[16] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а.10 адв.–11.

[17] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а.115.

[18] P. Powierza, *Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku…*, *op.cit*., s. 103.

[19] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а.1, 7, 8, 58.

захаваўся дакумент пра продаж на аўкцыёне маёмасці жыхароў спаленай ваколіцы:

Торговый лист
На продажу разного скота, хлеба и движимости, принадлежащей
жителям Бельского уезда дер. Луковицы.
Составлена 27 сентября 1863 года[20]

| № | Название предметов | На какую сумму продано | |
|---|---|---|---|
| | | серебром | |
| | | Руб. | Коп. |
| 1 | Лошадей пятнадцать штук | 225 | ,, |
| 2 | Рогатого скота сто одиннадцать штук | 979 | 50 |
| 3 | Овец двести сорок пять штук | 245 | ,, |
| 4 | Свиней сто тридцать штук | 339 | ,, |
| 5 | Гусей двадцать девять штук | 12 | 76 |
| 6 | Ржи в зерне четырнадцать с половиной корца | 29 | ,, |
| 7 | Пшеницы в зерне восемь корцов | 32 | ,, |
| 8 | Ячменя в зерне три с половиной корца | 7 | ,, |
| 9 | Овса в зерне один с половиной корцов | 9 | ,, |
| 10 | Гороху два корца | 5 | ,, |
| 11 | Льняного семени пять с половиною корцов | 22 | ,, |
| 12 | Конопляного семени полукорца | 1 | ,, |
| 13 | Чечевицы один корец и два гарнца | 1 | ,, |
| 14 | Картофеля пятнадцать с половиной корца | 26 | ,, |
| 15 | Капусты две тысячи головок | 15 | ,, |
| 16 | Сала свиного два пуда | 8 | ,, |
| 17 | Фасоли один корец | 3 | ,, |
| 18 | Полотна семь кусков | 11 | ,, |
| 19 | Сена двадцать один воз | 63 | ,, |
| 20 | Разной мебели | 89 | 84 |
| 21 | Разные хозяйственные снаряды | 146 | 48 |

[20] Дата па старому стылю; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 32–32 адв.

| № | Название предметов | На какую сумму продано | |
|---|---|---|---|
| | | серебром | |
| | | Руб. | Коп. |
| 22 | Сем кож | 23 | 70 |
| 23 | Овечей шерсти | 19 | 50 |

А всего выручено с продажи 2306 78

На подлинном написано: „Торги производил помощник Бельского уездного исправника Соболевский. При продажи находились Артиллерии Прапорщик Судзинский, Корнет Шишмаров.

С подлинным верно:

Судебный следователь (подпіс неразборлівы)".

Акрамя таго, па другой ведамасці паказаны продаж 4 кароў і 8 быкоў на суму 174 руб. Разам гэта дае 2480 руб. 78 капеек, але па дадзеным гродзенскага губернатара, якія ён падаў у Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў, агульная сума з продажу на аўкцыёне дасягала 3740 руб. 65 ¼ кап.[21]. Гэтыя грошы адпраўляліся ў Першы дэпартамент Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. а пазней – губернатарам, на тэрыторыі якіх жылі дэпартаваныя і раздаваліся ім пароўну. Пра тое, што грошы незаўсёды і не так хутка даходзілі да былых гаспадароў маёмасці сведчыць значная перапіска чыноўнікаў розных расійскіх устаноў, а таксама просьбы высланных аб прызначэнні ім дзяржаўнай дапамогі па беднасці.

Канфіскоўваліся ў дэпартуемых таксама землі:

- усадзебная – 17 дзесяцін 1957 сажэняў
- пахатная – 185 дзес. 1850 саж.
- сенакосная – 16 дзес.1328 саж.

Усяго зручнай зямлі – 220 дзес. 335 саж.

[21] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 33, 82.

- Лес – 186 дзес. 705 саж.
- Пад вуліцай і дарогай – 2 дзес. 1638 саж.
- Пад ракой – 850 саж.

Усяго удобнай і неудобнай – 409 дзесяцін 1128 сажэняў, якія былі ў валоданні шляхты. Землі памерам у 10 дзесяцін былі дадзены батракам маёнтка Пёткава, якія ліквідавалі пажар у мясцовым цэхгаўзе, падпаленым паўстанцамі: Ф. А.Свідэрскаму, А.П. Кушальчуку, Ф.Л. Астржыгала, мешчаніну г. Бельска О.П. Паплаўскаму, кучару В.К. Ігнатоўскаму. Кожнаму далі яшчэ па 4 дзесяціны лесу. Зямлю далі таксама сялянам суседніх вёсак Топчава, Валокі, Асаўкі, Лізы. Захаваўся толькі спіс асоб в. Топчава і Лізы, якім далі па 5 ці 10 дзес. зямлі: адстаўныя салдаты П.В. Карпіс, Л.С. Карпешук, К.Я. Прыгода, П.Ф. Бараноўскі, М.А. Апушка, агароднікі А.М. Пржесняк, В.В. Матысюк, К.В. Сідаровіч, В.І. Давыдзюк, К.В. Асташэўскі, Ф.І. Давыдзюк, П.І. Ксенжык, А.М. Аляшчук, удава А.Ф. Апушка (мужа Паўла паўстанцы павесілі)[22].

У імянным спісе высланных 13(25), па іншым дадзеным 14 (26) кастрычніка 1863 г. было 42 сям'і (29 дваранскіх, 1 салдатка, 1 служанка, 9 сялянскіх, 2 служачых памежнай аховы па акцызу)[23]:

| | |
|---|---|
| 1-е сямейства выслана ў Самарскую губерню: | 2-е сямейства выслана ў Самарскую губерню: |
| 1. Плонская Паўліна, 30 гадоў | 1. Плонская Апалонія, 29, у шпіталі |
| 2. Плонскі Іосіф, 46 гадоў | 2. Плонскі Станіслаў, 40 |
| 3. Дачка Ганна, 12 | 3. Сыны: Аляксандр, 8, у шпіталі |
| 4. Сыны: Іван, 5 г. | 4. Рыгор, 2, у шпіталі |
| 5. Фердынант, 3 | 5. Дачка Богуміла, 10 |
| 6. Сцяпан, 1 | |

[22] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 33, 34, 39.

[23] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а.41–44; с. 372, а. 14–17 адв., 40, 60–62, 66, 115, 264

| | |
|---|---|
| 3-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Шымборскі Шімон, 37<br>2. Шымборская Паўліна, 30, у шпіталі (нарадзіла 12.1 сына Франца)<br>3. Маці Малгажата, 55, у шпіталі<br>4. Сын Іван, 3, у шпіталі | 4-е сямейства пакінута ва ўездзе:<br>1. Удава Мар'янна Пекатоўская (Пекутоўская), 64<br>2. Дачка Анэля |
| 5-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Алендскі Франц Матвееў, 48<br>2. Жонка Тэафілія (Феафілія), 32<br>3. Сыны Уладзіслаў, 16<br>4. Карл, 3, у шпіталі<br>5. Фама, 1, у шпіталі<br>6. Дачка Елізавета, 6 | 6-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Пекутовскі Сільверст, 60<br>2. Жонка Магдаліна, 58<br>3. Сын Іван, 28<br>4. Жонка яго Іосіфата. 29<br>5. Дачкі іх Ганна, 3<br>6. Кацярына. 1,5<br>7. Дачка Сільвестра Розалія, 10 |
| 7-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Шымборскій Іосіф, 59<br>2. Жонка яго Магдаліна, 46<br>3. Сыны: Іван, 18, у шпіталі<br>4. Антон, 15, у шпіталі<br>5. Дачкі: Пелагея, 21<br>6. Мар'янна, 12, у шпіталі | 8-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Тржешчкоўская Дамініка, 35<br>2. Сын Міхаіл, 2<br>3. Дачка Брыгіда, 4 |
| 9-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Лучай Павел, 25<br>2. Маці яго Іосіфата, 50<br>3. Сястра Мар'яння,12 | 10-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Алендскі Варфаламей, 60<br>2. Жонка Мозелька (Маніла), 55<br>3. Сын Антон, 17 |

| | |
|---|---|
| 11-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Залеская Іосіфата,32<br>2. Сыны: Міхаіл, 10<br>3. Баляславў, 6<br>4. Рамуальд, 3<br>5. Дачкі: Багуміла, 14<br>6. Зоф'я, 12 | 12-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Алендскі Павел, 45<br>2. Жонка Апалонія, 35<br>3. Сын Уладзімір, 4 |
| 13-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Алендскі Франц, 42<br>2. Жонка Мар'янна, 40<br>3. Сын Іван, 12<br>4. Дачка Паўліна, 1 | 14-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Алендскі Міхаіл, 34<br>2. Жонка Паўліна, 25<br>3. Дачкі: Мар'янна<br>4. Ганна<br>5. Брат Міхаіла Іосіф, 30 |
| 15-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Плонскі Антон, 65<br>2. Жонка Антаніна, 60 | 16-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Алендскі Мар'ян, 32<br>2. Жонка Эмілія, 27<br>3. Сын Войцех,4<br>4. Дачкі: Караліна, 5<br>5. Багуміла, 1 |
| 17-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Залескі Іван, 70<br>2. Жонка Зузанна, 60 | 18-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Маркоўскі Вікенці, 50<br>2. Жонка Кацярына, 40<br>3. Сыны: Іван, 22<br>4. Франц, 18<br>5. Матеўш, 16<br>6. Іосіф, 14<br>7. Александр. 7<br>8. Дачка Багуміла,4 |

| | |
|---|---|
| 19-е сямейства выслана ў амарскую губ.:<br>1. Пяркоўскі Міхаіл, 57<br>2. Жонка Мар'янна, 60<br>3. Сын Іван, 18 | 20-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Бржэзоўскі Іосіф, 70<br>2. Жонка Ганна, 50<br>3.Сын Валенцій, 20<br>4.Дачка Сабіна, 16<br>5.Пароўская Кацярына, удава, 35<br>6. Сын Фабіян, 1<br>7. Дачка Ганна, 4 |
| 21-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Фалькоўскі Іван, 47<br>2. Жонка Караліна, 40<br>3. Сыны: Андрэй, 16<br>4. Франц, 9<br>5. Дачкі: Мар'янна, 14<br>6. Эмілія, 4 | 22-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Алендскі Іван, 50<br>2. Жонка Элеонора, 35<br>3. Сыны: Іосіф, 13<br>4. Вікенцій, 4<br>5. Дачкі: Мар'янна, 0,5<br>6. Ганна, 7<br>7. Маці Івана Кацярына<br>8. Дачка Кацярыны Мар'янна, 20 |
| 23-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Дрангоўскі Франц, 69, у шпіталі<br>2. Жонка Кляра, 70 | 24-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Залескі Аляксандр, 25<br>2. Маці яго Тэкля (Фёкла), за яе хадайнічаў перад грозенскім губернатарам Барэйша – 75 гадовую прасіў аддаць сыну Францу ў Драгічын.<br>3. Служанка Францішка |

| | |
|---|---|
| 25-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Маркоўскі Франц, 25<br>2. Брат Вікенцій, 20 | 26-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Лапінскі Андрэй, 36<br>2. Жонка Іосіфа (Юзэфа), 40<br>3. Дачкі: Аляксандра, 9<br>4. Ганна, 1<br>5. Маці Анэля, 57 |
| 27-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Хмялкоўскі (Ямялкоўскі) Клеменцій, 37<br>2. Брат Фама, 35<br>3. Маці іх Кацярына, 65<br>4. Сястра Ганна, 24 | 28-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Хмялкоўскі (Ямялкоўскі) Канстанцін, 33<br>2. Маці яго Вераніка, 67<br>3. Сёстры: Амелія (Анеля), 23<br>4. Міхаліна, 10 |
| 29-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Фалькоўскі Сцяпан, 83<br>2. Жонка Елісавета, 65<br>3. Сын Віктар,<br>4. Дачка Ганна, 23 | 30-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Урублеўскі Іван, 52<br>2. Жонка Мар'янна, 35,<br>3. Сыны: Мацей, 9<br>4. Марцін, 0,5<br>5. Дачкі: Кацярына, 9<br>6. Багуміла |
| 31-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Завацкая Кацярына, удава, 60<br>2. Сын Іван, 10<br>3. Дачкі: Мар'яна, 24<br>4. Апалонія, 29<br>5. Сын апошняй Аляксандр. 5 | 32-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Завацкі Іван, 55<br>2. Жонка Францішка, 63<br>3. Сын Франц, 13 |

| | |
|---|---|
| 33-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Завацкі Антон, 67<br>2. Жонка Кацярына, 61<br>3. Дачкі: Іосіфа<br>4. Ганна, 22<br>5. Сын Іосіфы – Фама | 34-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Бржествіцкая Анастазія, удава, 52<br>2. Сын Ігнацій, 20 |
| 35-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Багінскі (Сашынскі) Іван, 57<br>2. Жонка Кацярына, 48<br>3. Сын Баніфацый,16 | 36-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1. Свідэрскі Лаўрэнцій, 67<br>2. Жонка Мар’янна, 43 |
| 37-е сямейства, салдатка акінута ў Бельскім уездзе<br>1. Петрунчыкова (Петрынчыкова. Петрушчак) Кляра, 65<br>2. Сястра (? дачка) Аляксандра, 22<br>3. Дачка Аляксандры Тэафіля, 2 | 38-е сямейства пакінутае ў краі:<br>1. Пржэбыльска Магдалена, у шпіталі<br>2. Служанка Міхала Будлеўскага, які ў Лукавіцах не быў і невядома дзе цяпер знаходзіцца |
| 39-е сямейства, дваранка пакінута ў краі<br>1. Васілеўская Петрунеля, дваранка, 23 | 40-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1.Руткоўская (Рушкоўская) Анастазія, сялянка, 40<br>2. Сыны: Фома,10<br>3. Рыгор,9<br>4.Дачка Анастазія, 5 |

| | |
|---|---|
| 41-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1.Міхалоўскі Адам, 55, казённы аб'езчык памежнай аховы, калі на дзеючай службе, дык пакінуць ва ўздзе.<br>2.Жонка Ганна, 40<br>3.Сястра яе Кунігунда | 42-е сямейства выслана ў Самарскую губ.:<br>1.Следнюк (Следзюк) Фама, 43, адстаўны унцер-афіцэр, казённы аб'езчык памежнай аховы, калі на дзеючай службе дык пакінуць у Бельску.<br>2.Жонка Тэкля, 40<br>3.Сёстра Тэклі Юзэфа, 25<br>5.Сын Юзэфы Іосіф |

У справе, з якой мы прывялі матэрыялы пра высланых, гаворыцца, што на аснове Высачайшага павялення ад 17.05.1867 г. І. Бжезоўскі, К. Пароўская, І. Фалькоўскі, І. Алендскій, Ф. Дрангоўскі, Ф. Маркоўскі, А. Лапінскі, К. Хмялкоўскі, К. Хмялкоўскі перасяліліся ў Царства Польскае (Ломжынская і Аўгустоўская губерні). У Самарскай губ. у 1864 г. знаходзіліся І. Плонскі, Ст. Плонскі, Ш. Шымборскі, Ф. Матвееў Алендскі, С. Пекутоўскі, І. Шымборскі, Д. Трокацоўская, П. Лучай, В. Алендскі, Ф. Алендскі, М. Алендскі, А. ПлонскіМ. Алендскі, І. Залескі, М. Перкоўскі, А. Руткоўскі, А. Міхалоўскі. Іх перасялілі потым у Пермскую губ. У Енісейскай губ. жыў Ф. Алендскі[24].

Каб застрашыць мясцовае насельніцтва ў час новага пад'ёма паўстання вясной 1864 г. у Каралеўстве Польскім, 24.05.1864 г. была спалена вёска Прушанка-Баранка Бельскага ўезда, а жыхары высланы ў Сібір. На іх месца пасялілі рускіх каланістаў (на 1.09.1869 г. іх было 11 сем'яў – 64 чал.)[25]. Маёмасць высланых жыхароў прадавалася з аўкцыёна[26]. Выслалі наступных:

[24] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а.52, 53 аб., 85 адв.–86.

[25] А. Радзюк, *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў...*, *op.cit.*, s. 166, 168; P. Powierza, *Wspomnienia z Powstania Styczniowego...*, *op.cit.*, s. 103.

[26] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а.7.

1. Боржым Рох Янавіч, шляхціц.
2. Война Казімір Янавіч, шляхціц.
3. Палятыла Пётр Францэвіч, шляхціц.
4. Прушынская Агата, аднадворка, удава.
5. Прушынская Апалонія, шляхцянка, удава.
6. Прушынскі Войцех Аўгустынавіч, аднадворац.
7. Прушынскі Тамаш Мартынавіч, шляхціц.
8. Прушынскі Ігнаці Вайцэхавіч, шляхціц.
9. Прушынскі Леанард Францэвіч, шляхціц.
10. Прушынскі Пётр Якаўлевіч, шляхціц.
11. Прышынскі Францішак Янавіч, шляхціц.
12. Прышынскі Францішак Казіміравіч, шляхціц.
13. Прушынскі Ян Ігнацевіч, шляхціц.
14. Прушынскі Ян Яцэнцевіч, аднадворац.
15. Умінскі Вікенці Янавіч, аднадворац.
16. Шмурло Міхал Варфаламеевіч, аднадворац.
17. Яблонскі Ян Мартынавіч, шляхціц[27].

Такім чынам, выконвалася “сістэма Мураўёва”. Спальванне шляхецкіх ваколіц і дэпартацыя жыхароў павінны былі вырашаць бліжэйшыя і перспектыўныя задачы. Спачатку запалохаць іншы шляхецкі элемент і адарваць яго ад паўстанцкага руху, а такім чынам загасіць паўстанне. А на перспектыву ад шляхты адбіралі зямлю, маёмасць – падрывалі эканамічны стан (“залезлі ў кішэню”, як гаварыў Мураўёў), каб яна не магла фінансаваць будучыя паўстанні. Да таго ж на шляхецкія землі мяркавалі завесці расійскіх землеўладальнікаў для таго, каб узмацніць “рускі элемент” у “Заходнім краі”.

[27] С. Муліна, *Удзельнікі паўстання 1863 года…*, *op.cit.*, s. 265–268; НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 6, с. 22, а. 383.

## Бібліяграфія:

1. *Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864*, Москва 1965.
2. Муліна С., *Удзельнікі паўстання 1863 года з Заходняга краю ў заходнесібірскай ссылцы*, „Arche" 12/2010, с. 258–268.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025.
4. НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57.
5. НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372
6. НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507.
7. НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 6, с. 22.
8. Радзюк А., *Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне ў 1863–1864 гг.*, „Arche" 12/2010, с. 151–173.
9. *1863. Katalog miejsc pamięci powstania styczniowego w województwie podlaskim*, Białystok 2013, s. 35.
10. Pawłowicz E. *Wspomnienia. Nowogródek, więzienie–wygnanie*, Lwów 1887.
11. Powierza P., *Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora*, Białystok 1996.